**А. М. Чарнышова**
Філалагічны факультэт,
кафедра беларускай мовы

# АСАБЛІВАСЦІ НЕВЕРБАЛЬНЫХ ПАВОДЗІН У ДЗЕЙНАСЦІ ВЫКЛАДЧЫКА ВНУ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У цяперашні час на старонках псіхолага-педагагічнай літаратуры вялікая ўвага надаецца праблеме зносін у прафесійна-педагагічнай дзейнасці. Так, без зносін, як фундаментальнай патрэбы чалавека немагчыма ўявіць працэс перадачы пэўнай інфармацыі ад адной асобы другой. У працэсе педагагічных зносін ажыццяўляецца не толькі навучанне прыёмам і спосабам разумовай дзейнасці, фарміраванне мысленчых працэсаў, але і пастаяннае падтрыманне зацікаўленасці вучняў на занятках, забеспячэнне нарматыўных узаемаадносін з калектывам і з выкладчыкам, зменшанне эмацыянальнай напружанасці.

Адным з аспектаў дадзенай праблемы з'яўляецца вывучэнне невербальных сродкаў зносін. Адзначым пры гэтым, што праблема інтэрпрэтацыі невербальных аспектаў міжасобасных зносін мае вялікую гісторыю. Аднак дэталёва данае пытанне пачалі разглядаць толькі ў апошнія дзесяцігоддзі (пачынаючы з 60-х гг. у працах Дж. Фаста, А. Піза, І. Н. Гарэлава, В. А. Лабунскай, Р. Я. Крэйдліна і інш.). У сувязі з гэтым, яно застаецца мала даследаваным. Аднак з кожным годам вучоныя пераконваюцца ў тым, наколькі значнымі аказваюцца невербальныя сродкі ў працэсе ўзаемадзеяння людзей.

У прыватнасці, вучоныя ўстанавілі, што перадача інфармацыі адбываецца за кошт вербальных сродкаў (непасрэдна словамі) на 7 %, за кошт гукавых сродкаў (уключаючы тон голасу, інтанацыю) – на 38 % і за кошт невербальных сродкаў на 55 % [1, с. 6].

Як сцвярджае Л. М. Міціна, "узаемадзеянне вучня і настаўніка складаецца, перш за ўсё, у абмене паміж імі інфармацыяй пазнавальнага і афектыўна-ацэначнага характару. І перадача гэтай інфармацыі ажыццяўляецца як вербальным шляхам, так і з дапамогай розных сродкаў невербальнай камунікацыі" [2, с. 44].

Педагог падчас узаемадзеяння са студэнтамі значную частку інфармацыі адносна іх эмацыянальнага стану, намераў, адносін да чаго-небудзь атрымлівае не са слоў вучняў, а з жэстаў, мімікі, інтанацыі, паставы, погляду, манеры слухаць. Вучоныя звяртаюць увагу на тое, што невербальны кампанент зносін адыгрывае істотную ролю ў працэсе ўзаемадзеяння выкладчыка са студэнтамі, паколькі вядома, што розныя сродкі невербальных зносін аказваюцца

ў некаторых выпадках больш выразнымі і дзейснымі, чым словы [3, с. 10].

Адзначым, што сродкі невербальнай камунікацыі заўсёды адпаведным чынам задзейнічаны ў ходзе вучэбна-выхаваўчага працэсу, нягледзячы на тое, што, як правіла, педагог не ўсведамляе іх значэння. Агульнапрынята, што ва ўзаемадзеянні выкладчыка са студэнтамі, як і любых суб’ектаў зносін, невербальнае ўздзеянне ажыццяўляецца па наступных каналах: жэст, міміка, тактыльны кантакт, дыстанцыя, візуальнае ўзаемадзеянне, інтанацыя.

Спынімся на некаторых з іх.

Асаблівае месца ў сістэме невербальных зносін выкладчыка займае сістэма жэстаў. Жэстыкуляцыя педагога з’яўляецца для вучняў адным з індыкатараў адносін да іх. Характар жэстаў настаўніка з першых хвілін стварае пэўны настрой у групе. Даследаванні пацвярджаюць, што калі рухі выкладчыка нервовыя, то ў выніку гэтага замест гатоўнасці да ўрока ўзнікае стан напружанага чакання непрыемнасцей. Вялікую ролю адыгрываюць жэсты і ў забеспячэнні ўвагі студэнтаў, якая з’яўляецца найважнейшай умовай эфектыўнага навучання. Значнымі магчымасцямі засяроджвання ўвагі слухачоў валодае менавіта жэст, эмацыянальная насычанасць якога прыцягвае ўвагу аўдыторыі. Сярод сродкаў арганізацыі ўвагі амаль кожным настаўнікам актыўна выкарыстоўваюцца такія жэсты, як жэсты ўказання, жэсты імітацыі, жэсты падкрэслення і г. д. Не менш важная ў выкарыстанні жэстаў і такая функцыя, як актывізацыя розных пазнавальных працэсаў (успрымання, памяці, мыслення, уяўлення). Жэсты могуць ілюстраваць маналог выкладчыка, з іх дапамогай можа ажыццяўляцца актывізацыя зрокавага ўспрымання, памяці, наглядна-вобразнага мыслення.

Сумесная дзейнасць выкладчыка і студэнтаў прадугледжвае не толькі ўздзеянне педагога, але і абавязковую зваротную сувязь. Менавіта з дапамогай жэста выкладчыка часта пачынаецца гэтая сувязь (запытальны ківок галавой, запрашальныя жэсты), павышаецца яе інтэнсіўнасць (жэсты адабрэння, ацэнкі) або завяршаецца кантакт. Жэст выступае важным кампанентам зваротнай сувязі, без разумення якога абцяжарваецца адэкватная ацэнка стану педагогам навучэнца, яго адносіны да педагога.

Мімічныя зносіны – вельмі важны складнік узаемадзеяння паміж выкладчыкам і студэнтамі. Бясконцая разнастайнасць мімічных рухаў дае магчымасць педагогу выказаць свой эмацыянальны стан і стаўленне да пэўнага вучня, яго адказу або ўчынкаў: адлюстраваць цікавасць, разуменне або абыякавасць і г. д. Вучоныя сцвярджаюць,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

што навучэнцы аддаюць перавагу выкладчыкам з добразычлівым выразам твару, з высокім узроўнем знешняй эмацыянальнасці. Пры гэтым адзначаецца, што празмерная рухомасць вачэй або твару, як і іх статычнасць, стварае сур'ёзныя праблемы ў зносінах са студэнтамі.

Некаторыя даследчыкі адзначаюць, што многія педагогі лічаць неабходным ствараць "спецыяльны выраз твару" для ўздзеяння на вучняў. Часта – гэта строгі выраз з нахмураным ілбом, сціснутымі вуснамі. Такі твар, на думку выкладчыкаў, спрыяе добрым паводзінам і паспяховасці вучняў, спрашчае кіраўніцтва, кіраванне класам.

Яшчэ адзін канал невербальных зносін – дотык ці тактыльная камунікацыя. З дапамогай дотыку можна прыцягнуць увагу, устанавіць кантакт, выказаць сваё стаўленне да студэнта. Свабоднае перамяшчэнне выкладчыка на занятках палягчае выкарыстанне гэтага прыёму. Не спыняючы выклад матэрыялу, ён можа вярнуць да працы студэнта, які перастаў слухаць, дакрануўшыся да яго рукі, пляча; супакоіць узбуджанага; адзначыць удалы адказ.

Аднак кожнаму выкладчыку трэба памятаць, што ў некаторых студэнтаў дотык можа выклікаць насцярожанасць. У першую чаргу, гэта бывае ў вучняў, для якіх скарачэнне дыстанцыі з'яўляецца нязручным і вызначаецца трывогай. Непрыемны дотык, які нясе адценне ціску, сілы.

Немалаважнае значэнне мае і дыстанцыя зносін. Псіхолагі сцвярджаюць, што дыстанцыя паміж субяседнікамі залежыць ад адносін паміж імі. Выкладчыку асабліва важна разумець сувязь паміж працэсам зносін і размяшчэннем суразмоўцаў адносна адзін аднаго ў прасторы.

Прасторавыя фактары зносін выкарыстоўвае любы педагог, інтуітыўна выбіраючы аптымальную адлегласць да студэнтаў; пры гэтым вялікае значэнне мае характар узаемаадносін з аўдыторыяй, памеры памяшкання, памер групы. Ён можа выкарыстоўваць прасторавую блізкасць для ўстанаўлення больш даверных адносін з вучнямі, але захоўваць пры гэтым асцярожнасць, так як празмернае набліжэнне да субяседніка часам успрымаецца як замах на асобу, выглядае нетактоўным.

Назіраючы за працай выкладчыка падчас практычных заняткаў, можна заўважыць, што зона найбольш эфектыўнага кантакту – гэта першыя 2–3 парты. Менавіта першыя парты трапляюць у асабістую або нават інтымную зону на працягу амаль усяго ўрока. Астатнія студэнты, як правіла, знаходзяцца на публічнай адлегласці ад выкладчыка (тэрмін А. Піза) [4].

Калі педагог перамяшчаецца па аўдыторыі, то ён, змяняючы дыстанцыю, дасягае праксемічнай разнастайнасці і роўнасці ў зносінах з кожным студэнтам.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Такім чынам, невербальны складнік зносін займае значнае месца ў працэсе ўзаемадзеяння педагога са студэнтамі. Для таго, каб палегчыць сваю працу, педагог павінен умець кантактаваць са студэнтамі, нават не размаўляючы, павінен акцэнтаваць увагу не толькі на мове, але і на кожным жэсце студэнта, поглядзе, мімічных рухах, з другога боку –строга кантраляваць свае невербальныя паводзіны.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1 Кудинова, Е. С. Взаимодействие невербальных и речевых характеристик в процессе коммуникации / Е. С. Кудинова // Вестник Московского государственного лингвистического университета. – 2010. – Выпуск 1 (580). – С. 55–78.

2 Митина, Л. М. Управлять или подавлять : выбор стратегии профессиональной деятельности педагога / Л. М. Митина. – М. : Сентябрь, 1999. – 192 с.

3 Петрова, Е. А. Жесты в педагогическом процессе: учебное пособие / Е. А. Петрова. – М. : Моск. городское пед. общество, 1998. – 278 с.

4 Пиз, А. Язык телодвижений / А. Пиз. – Кострома : ИПП «Кострома», 1992. – 172 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ